№ 30 (421)

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Аўторак
18
кастрычніка
1960 г.

Цана 10 кап.

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна



## З шахцёрскай загартоўкай

ПЕРАД сакратаром райкома камсамола стаяў зусім юны хлапчук, на выгляд якому можна было даць толькі 13 год, хоць яму стукнула 16. Акінуўшы Уладзіміра недаверлівым позіркам, сакратар райкома камсамола здзіўлена запытаўся:

— І вы таксама?!

Ад такога нечаканага пытання халадок прабег па целу. У першую мінуту Уладзімір было разгубіўся, зразумеўшы, што ўся загвоздка ў яго росце. Недзе ў глыбіні яго вачэй успыхнуў дзёрзкі агеньчык і зараз жа ён задзірыста выпаліў:

— А што, я горш іншых?

Сакратар усміхнуўся.

— Колькі табе год?

— Шаснаццаць...

— Працаваў?

— Сямігодку закончыў.

— Спецыяльнасці няма, а хочаш ехаць?

— Няма дык будзе, — упэўнена адсек Уладзімір.

— Ну, добра. Як тваё прозвішча?

— Уладзімір Уласаў, — узрадаваўся юнак, убачыўшы, што справа хіліцца ў яго бок.

А праз некалькі дзён пасажырскі поезд, выстукваючы на стыках рэльсаў бадзёры напеў маршавай песні, якая вярцелася ў галаве Уладзіміра, з кожнай мінутай усё далей увозіў яго ад роднай станіцы Кубанскай. За акном, быццам стараючыся нагнаць адзін другога, беглі тэлеграфныя слупы, мільгалі населеныя пункты, пералескі...

Быў 1949 год. Краіна залечвала апошнія раны, нанесеныя ёй гітлераўскімі захопнікамі. З попелу вырасталі кварталы жылых дамоў, заводы, фабрыкі. А каб удыхнуць у іх жыццё, патрэбны былі тысячы тон «чорнага золата».

Сівы Данбас ляжаў у руінах. Камсамол кінуў заклік: «Усе на аднаўленне шахт!» Юнакі і дзяўчаты накіраваліся туды не дзеля рамантыкі, а дзеля агульнай справы. Быў сярод іх і Уладзімір Уласаў.

З камсамольскім аганьком працавала моладзь. Ваганеткі вугалю адна за другой ідуць нагара. Як прыемна ўсведамляць, што тут і твая доля працы! Глядзіш, і ўсё больш расце жаданне самому здабываць гэты хлеб прамысловасці. І Уладзімір паступае ў горна-прамысловае вучылішча, паспяхова заканчвае яго, хутка сам «рубае» вугалёк.

Прыкметна расце Уладзімір у працы, сіле. Гэта ўжо не той юнак, а моцны здаровы хлапец, перадавік вытворчасці, якога праводзяць сябры і таварышы на флот.

Хутка прабег тэрмін службы. І калі настаў дзень дэмабілізацыі, рашэнне было цвёрдым: на родную шахту імя Арцёма.

І зноў «яго вугалёк» пайшоў на-гара. На гэты раз ён працаваў у брыгадзе Героя Сацыялістычнай Працы Івана Філіпавіча Філіпава.

Як перадавога работніка вытворчасці, яго пераводзяць майстрам вытворчага навучання у горна-прамысловую школу, якую ён калісьці закончыў. І тут Уладзімір зразумеў, што тых ведаў, якія ёсць у яго, малавата. Ён паступае ў вячэрнюю школу. Яго абіраюць сакратаром камсамольскай арганізацыі вучылічша, рэкамендуюць у члены партыі.

Паспяхова закончыўшы школу, Уладзімір паступае на юрыдычны факультэт нашага універсітэта.

В. АНЦЫФЕРАЎ.

## НА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАХ

*Група першакурснікаў аддзялення рускай мовы і літаратуры схілілася над канспектамі, праглядаючы запісы, высвятляючы паміж сабой асобныя пытанні. Сёння—першыя семінарскія заняткі па кнізе У. І. Леніна «Што рабіць?».*

*Мяркуючы па ўсяму, студэнты добра падрыхтаваліся, і можна чакаць, што практычныя заняткі па гісторыі КПСС пройдуць ажыўлена.*

*Празвінеў званок. Кіраўнік семінара Павел Паўлавіч Сілівончык адзначыўшы адсутных (іх было двое) пытае:*

*— Хто жадае расказаць аб уздыме рэвалюцыйнага руху і стане сацыял-дэмакратычных арганізацый у Расіі напярэдадні выхаду ў свет кнігі Леніна «Што рабіць?»?*



*Доўга чакаць не прыходзіцца. Першай руку падымае дзяўчына ў ружовай сукенцы. Гэта — Марыя Карповіч, камсорг аддзялення. Не спяшаючыся, з добрым веданнем матэрыялу, яна адказвае на пытанне. У запісной кніжцы кіраўніка семінара супраць яе прозвішча паяўляецца — «выдатна». Жадаючых дапаўняць гэтае пытанне няма. Тады Павел Паўлавіч напамінае студэнтам, што пры адказе трэба было сказаць аб сацыял-дэмакратычных гуртках Благоева, Тачыскага, Бруснева, Федасеева, і коротка расказвае аб значэнні работы гэтых гурткоў.*

*Па другому пытанню «Эканамізм у Расіі і рознавіднасць міжнароднага апартунізма і барацьба Леніна супраць рэвізіі марксізма» выступае Леанід Кавальчук. Ён таксама добра падрыхтаваўся да семінара, але ў сваім адказе не сказаў аб барацьбе У. І. Леніна супраць рэвізіяністаў. Яго адказ ацэнен на «добра».*

*Аднак з усіх выступаючых ніхто не прывёў яркай характарыстыкі У. І. Леніна, дадзенай ім рэвізіяністам. Давялося напомніць аб гэтым студэнтам Паўлу Паўлавічу.*



Тэкст і фота
А. ВІТАВА.

## Шырэй дарогу хіміі

Масква, Ленінград, Кіеў, Ташкент, Свярдлоўск, Алма-Ата. Усё гэта велізарны шлях, які зроблен Усесаюзнай перасоўнай выстаўкай хімічных рэактываў і ізатопаў да таго, як пачаць сваю работу ў нашым універсітэце. Яна створана дзяржаўным камітэтам Савета Міністраў па хіміі. Ініцыятарам у яе арганізацыі з'яўляецца Усесаюзнае таварыства імя Мендзелеева, якое паставіла сваёй мэтай паказаць прадукцыю хімічных рэактываў і ізатопаў, якія выпускаюцца нашай прамысловасцю. Няма ж цяпер такой галіны народнай гаспадаркі, дзе б не былі прымenены вырабы хіміі.

Калі ўваходзіш у залу выстаўкі, вочы разбягаюцца па велізарнай колькасці экспанатаў, сярод якіх хочаш адшукаць той, які табе патрэбен. І, зразумела, знаходзіш! Знаходзіш нават тое, чаго ніколі не бачыў у вочы, а толькі чытаў аб іх у кнігах або падручніках.

Вось невялікі кампактны прыбор-лабараторыя Магніцкага, змешчаны ў невялікай скрынцы. Для біёлага ён проста скарб. Пры дапамозе спецыяльнай табліцы ён дае магчымасць хутка ў палявых умовах вызначыць, чым харчуецца расліна, якіх арганічных солей не хапае для яе нармальнага развіцця.

Вялікую цікавасць выклікае спецыяльная апаратура, прызначаная для кансервавання клубняў бульбы, якія ідуць у харчаванне. Абпраменeная пры яе дапамозе гама-праменнямі бульба, якая ляжыць на складах, можа захоўвацца на працягу двух год.

Аб прымяненні радыёактыўных элементаў у мірных мэтах расказвае экспанат, які служыць для вызначэння якасці зваркі швоў трубапровада. Гэты спосаб аснаваны на вялікай святлоадчувальнасці фотаплёнкі да выпраменьвання радыёактыўных рэчываў.

Розныя свецячыяся саставы для рэклам, лёгкая эластычная ўпакоўка з поліэтылену, індыкатарная паперка для вызначэння якасці малака — усё гэта можна бачыць на перасоўнай выстаўцы, якая выклікае вялікую цікавасць не толькі ў мінчан, але і ў многіх спецыялістаў іншых гарадоў Беларусі.

Адчуваецца гэта ў цёплых, шчырых словах, змешчаных у кнізе водгукаў. Вось што піша студэнт другога курса хімфака Яўген Карпінчык. «Вядома, што наша краіна ў галіне навукі і тэхнікі ідзе далёка ўперадзе ўсіх краін, у яе авангардзе. Выстаўка хімічных рэактываў і ізатопаў пацвярджае гэта. На ёй шырока прадстаўлены неарганічныя рэактывы, іёнаабменныя солі, радыёактыўныя элементы і іх злучэнні (хоць прыменена імітацыя), рэдкія і асабліва чыстыя элементы і многа іншага. Вялікае дзякуй супрацоўнікам выстаўкі за карысную работу! Хочацца, каб падобныя выстаўкі арганізоўваліся часцей. Шырэй дарогу хіміі!»

НА ЗДЫМКУ ўнізе: наведвальнікі знаёмяцца з экспанатамі выстаўкі.

Тэкст і фота
В. БЕЖЫЦКАГА.

## Вытворчасці „Юрфак-фільм"...

**Кінакамеру ўсё часцей можна бачыць у руках следчага, аператыўнага работніка міліцыі. Гэта не дзіўна. Сродкі кіно дапамагаюць ім расследаваць многія злачынствы. І студэнты юрыдычнага факультэта, рыхтуючыся да сваёй будучай работы, імкнуцца авалодаць уменнем кіназдымкі — вось ужо другі год пры кабінеце крыміналістыкі працуе кінагурток. За гэты час яго члены пазнаёміліся з рознымі відамі кінаапаратуры, не раз удзельнічалі у здымках, апрацоўвалі фотаматэрыялы.**

**Вялікія планы ў гурткоўцаў у гэтым годзе. Яны збіраюцца стварыць некалькі фільмаў, якія змаглі б служыць вучэбнымі дапаможнікамі для будучых юрыстаў.**



## Коратка

☆ *Згодна з новым вучэбным планам, на юрыдычным факультэце ўпершыню ў гэтым навучальным годзе ўводзіцца практыка для студэнтаў першага курса. Яны азнаёмяцца з работай суда і пракуратуры.*

☆ *Адбылося паседжанне студэнцкага навуковага гуртка па заалогіі хрыбетных жывёл. З дакладам «Кібернетыка і біялогія» перад гурткоўцамі выступіў прафесар П. Ф. Ракіцкі.*

## ЗА КАМУНІСТЫЧНЫ БЫТ

Ужо трэці год студэнты самі падтрымліваюць чысціню ў інтэрнатах, ствараюць умовы для працы і адпачынку. Але яшчэ не ўсюды студсаветы дабіліся належнага парадку. Многія пакоі знаходзяцца ў дрэнным стане. Асабліва гэта назіраецца ў новым інтэрнаце па вуліцы Дзімітрава.

У мэтах паляпшэння жыллёвых умоў студэнтаў кожны год Міністэрствам асветы і рэспубліканскім Саветам прафсаюзаў праводзіцца конкурс на лепшую арганізацыю быту, рэжыму працы і актыўнага адпачынку студэнтаў. Конкурсы дапамагаюць выявіць недахопы ў рабоце інтэрнатаў, пераймаць лепшыя формы работы студсаветаў, прафкомаў і гаспадарчых частак навучальных устаноў. Конкурс праводзіцца на працягу ўсяго года. Вынікі яго падводзяцца ў кастрычніку — снежані месяцах.

Галоўнымі паказчыкамі, па якіх будуць вызначаны пераможцы конкрусу, з'яўляюцца добрая арганізацыя самаабслугоўвання, прыкладная чысціня ў пакоях, калідорах, кухнях, беражлівыя адносіны да грамадскай маёмасці, правядзенне ў інтэрнатах ранішняй гімнастыкі, арганізацыя культурна-масавых мерапрыемстваў у пакоях адпачынку.

Калектывы навучальных устаноў, асобныя работнікі і студэнты, што з лепшага боку пакажуць сябе ў выкананні ўмоў конкурсу, будуць узнагароджвацца рэктаратам, абласным і рэспубліканскім Саветамі прафсаюзаў і Міністэрствам асветы.

Студсаветы і грамадскія арганізацыі павінны разгарнуць шырокую работу за камуністычны быт у інтэрнатах нашага універсітэта.

А. ЦАЛКО,
член жыллёва-бытавой камісіі прафкома.

## Са справаздачна-выбарчых партыйных сходаў

# Плюсы і мінусы

Днямі адбыўся справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі хімічнага факультэта. З дакладам аб рабоце за справаздачны перыяд выступіў сакратар партбюро В. Ф. Бяляеў. Ён даў глыбокі аналіз усёй дзейнасці партыйнай арганізацыі, адзначыў тое станоўчае, што было ў яе рабоце, а таксама ўскрыў недахопы, якія тармазілі далейшы рух факультэта наперад.

Як адзначыў дакладчык, рэгулярна праводзіліся партыйныя сходы і пасяджэнні партбюро, на якіх абмяркоўваліся разнастайныя пытанні, звязаныя з паляпшэннем вучэбна-даследчай работы на факультэце, дзейнасці камсамольскай арганізацыі і інш. Як значны крок уперад у рабоце партарганізацыі трэба лічыць добрую пастаноўку палітыка-масавай работы сярод студэнтаў і супрацоўнікаў факультэта.

Дакладчык падкрэсліў, што своечасова была ўкамплектавана сетка партыйнай асветы. Ён адзначыў, што асабліва добра працаваў філасофскі семінар, якім кіраваў доктар філасофскіх навук В. І. Сцяпанаў.

Прыкметна палепшылася за гэты час спартыўная і абаронна-масавая работа на факультэце.

Несумненна, поспехі ў дзейнасці партарганізацыі ёсць. Але дакладчык не толькі гаварыў аб поспехах. Увага камуністаў была звернута таксама і на тыя сур'ёзныя недахопы, якія яшчэ не ліквідаваны і патрабуюць хутчэйшай ліквідацыі намаганнямі ўсіх камуністаў. Галоўным з гэтых недахопаў застаецца слабы кантроль за вучэбным працэсам. Не выпадкова на факультэце ёсць многа непаспяваючых студэнтаў. А падрыхтоўка ж высокакваліфікаваных спецыялістаў павінна знаходзіцца пастаянна ў цэнтры ўвагі партарганізацыі.

Сур'ёзныя недахопы ёсць і ў пастаноўцы навукова-даследчай работы, у падрыхтоўцы выкладчыцкіх кадраў. Вось прыклад. За апошнія тры гады ні адзін з 30 аспірантаў, закончыўшых аспірантуру, не абараніў кандыдацкай дысертацыі. Усё гэта выклікае трывогу, паколькі з шырокім развіццём хімічнага факультэта патрэбнасць у кадрах з году ў год павялічваецца.

Патрабуе значнага палепшання і выхаваўчая работа сярод студэнцтва. Яна павінна праводзіцца не толькі ў аўдыторыі, але і ў інтэрнаце. Але, як адзначыў дакладчык, некаторыя выкладчыкі мала або і зусім не наведваюць інтэрнаты, не ведаюць, як жывуць і чым займаюцца студэнты.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Выступіўшыя дэкан факультэта тав. Цішчанка, студэнтка Мардвінцава, выкладчыкі тт. Тур, Баркан і Маханёк гаварылі аб тых недахопах, якія яшчэ ёсць у рабоце партыйнай арганізацыі. Яны ўнеслі свае прапановы для паляпшэння дзейнасці партарганізацыі. Так, напрыклад, тав. Цішчанка, адзначаючы недахопы ў вучэбным працэсе, прапанаваў партарганізацыі больш канкрэтна займацца гэтым пытаннем. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на падрыхтоўку кадраў праз аспірантуру, а таксама на неабходнасць мець пастаянныя кадры на чале кафедр, што дасць магчымасць павысіць узровень выкладання. Тав. Цішчанка спыніўся на задачах у рабоце факультэта — падрыхтоўцы спецыялістаў для Старобінскага калійнага камбіната і Полацкага нафтабуда, а таксама для іншых прадпрыемстваў Беларусі.

— Партарганізацыя, — сказаў тав. Цішчанка, — мае ўсе магчымасці ўхіліць недахопы ў рабоце і працаваць яшчэ лепш.

Тт. Тур і Баркан у сваіх выступленнях гаварылі аб актывізацыі работы камсамольскай арганізацыі, каб яна сур'ёзна займалася не толькі вучэбнымі пытаннямі, але і спартыўнай, і абаронна-масавай работай, арганізацыяй культурна-адпачынку. гурткамі мастацкай самадзейнасці. Кожны камсамолец павінен паспяхова вучыцца — так было пастаўлена пытанне.

З прамовай на сходзе выступіў рэктар універсітэта тав. А. Н. Сеўчанка. Ён закрануў важныя пытанні ў жыцці партыйнай арганізацыі: рост яе радоў, падбор і выхаванне навуковых кадраў, гаварыў аб перспектывах развіцця хімічнага факультэта.

Партыйны сход абраў новы склад партыйнага бюро і прыняў пастанову, накіраваную на далейшае паляпшэнне дзейнасці партыйнай арганізацыі, на ўзмацненне яе ролі ў жыцці факультэта.

**А. ГРЫГОР'ЕЎ.**



НА ЗДЫМКУ: студэнтка чацвёртага курса хімфака Ларыса Ларыёнава рыхтуе апаратуру па вызначэнню ўдзельнай электраправоднасці хлорыстага калію.
Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

# Больш увагі партыйнай рабоце

10 кастрычніка адбыўся справаздачна-выбарчы сход пярвічнай партыйнай арганізацыі геаграфічнага факультэта. Са справаздачным дакладам выступіў таварыш Д. М. Карулін.

Як дакладчык, так і выступіўшыя ў спрэчках камуністы адзначалі ўзросшы ўзровень і мэтанакіраванасць ідэйнага выхавання студэнтаў, актывізацыю работы камсамольскіх груп на курсах, ажыўленне культурна-масавай і спартыўна-абароннай работы на факультэце, паляпшэнне якасці выкладання і рост тэарэтычных ведаў студэнтаў.

На факультэце рэгулярна праводзіліся палітінфармацыі па пытаннях унутранай і знешняй палітыкі Савецкай дзяржавы. Студэнты сустракаліся з членамі брыгад камуністычнай працы і заслужанымі дзеячамі навукі і мастацтва, вядомымі вучонымі, ўдзельнікамі антарктычных экспедыцый. Усё гэта, несумненна, аказала істотны ўплыў на паляпшэнне вучобы і дысцыпліны сярод студэнтаў. Так, напрыклад, калі ў 1958—1959 навучальным годзе студэнтамі факультэта было прапушчана 942 гадзіны вучэбных заняткаў без уважлівых прычын, то ў 1959—60 годзе колькасць пропускаў значна паменшылася. Лік непаспяваючых студэнтаў, атрымаўшых нездавальняючыя адзнакі ў перыяд вясенне-летняй экзаменацыйнай сесіі, скараціўся на 40 працэнтаў.

Выкладчыкі і лабаранты факультэта ў справаздачным годзе рэгулярна наведвалі семінарскія заняткі па вывучэнню гісторыі і дзейнасці камуністычных партый краін народнай дэмакратыі і некаторых капіталістычных краін. Загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі дацэнт Н. Я. Рагозін абараніў доктарскую дысертацыю, а дацэнт А. Я. Шкляр ў гэтым годзе заканчвае напісанне доктарскай дысертацыі. Членамі кафедр фізічнай і эканамічнай геаграфіі апублікаван рад навуковых прац і брашур аб народнай гаспадарцы і прыродзе Беларусі.

Разам з тым камуністы падверглі суровай крытыцы партыйнае бюро і дэканат за рад упушчэнняў і недахопаў у рабоце, асудзілі непартыйныя адносіны дацэнта Раманоўскага да абавязкаў вучонага.

Дагэтуль 13 студэнтаў факультэта не ліквідавалі акадэмічную запазычанасць. 7 студэнтаў, якія закончылі універсітэт у 1959—60 навучальным годзе, не прыбылі на работу па назначэнню. Не ліквідаваны яшчэ пропускі вучэбных заняткаў, ёсць факты грубага парушэння дысцыпліны на першым курсе.

— Навуковыя работнікі-географы, — сказаў тав. Шкляр, — вядуць вялікую даследчую работу. Але ніхто з нас не карыстаўся творчым водпускам, многія напісаныя артыкулы падоўгу залежваліся ў выдавецтвах. Партбюро не праявіла патрэбнай ініцыятывы, каб стварыць нармальныя ўмовы працы і адпачынку супрацоўнікам факультэта.

Рэктар універсітэта А. Н. Сеўчанка сказаў, што набліжаецца да канца будаўніцтва новага корпуса універсітэта, неабходна ў бліжэйшы трэмін скласці падрабязную заяўку на набыццё вучэбнага абсталявання і наглядных дапаможнікаў, прадумаць мэтазгоднасць размяшчэння аўдыторый і кабінетаў.

Партыйны сход абраў новы склад бюро факультэта, намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі адзначаных недахопаў.

**В. ШАПЛЫКА.**

# Аб'явіць вайну дармаедам!

Адбыўся справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі філалагічнага факультэта. З дакладам выступіў сакратар партбюро тав. М. А. Паўленка.

Партыйная арганізацыя ў сваёй рабоце кіравалася гістарычнымі рашэннямі XXI з'езду КПСС, XXIV з'езду КПБ, рашэннямі і пастановамі вышэй стаячых партыйных органаў.

Работа партыйнага бюро садзейнічала таму, каб вучэбны працэс на факультэце адпавядаў вучэбнаму плану, зацверджанаму Міністэрствам вышэйшай адукацыі. У выніку гэтага палепшылася якасць лекцый, часцей практыкаваліся адкрытыя лекцыі, павысілася паспяховасць студэнтаў. На факультэце ёсць многа студэнтаў, якія здалі сесію толькі на «выдатна» і «добра». Гэта такія таварышы, як Кавалькоў, Хадановіч, Ганчароў, Рагойша і многія іншыя. Імі па праву можа ганарыцца факультэт.

Але ў нас ёсць студэнты, якія цягнуць факультэт назад. Гэта «штатныя» даўжнікі Жулега, Жыдовіч, Нарчук і іншыя. Студэнты-дармаеды пакуль што спакойна адчуваюць сябе на факультэце, жывуць сабе ціханька па прынцыпу «ты мяне не чапай, і я цябе не крану». Так, відаць, і дойдуць да пятага курса.

Выступаўшыя ў спрэчках камуністы Лысенка, Цімафеева, Булацкі з абурэннем гаварылі аб тых, хто вось так «прыжыўся» у нашым калектыве. У паводзінах і быту некаторых студэнтаў часта здараюцца амаральныя ўчынкі, недастойныя савецкага чалавека. Гэта выражаецца ў грэблівых адносінах да працы, да людзей. Выявілася гэта ў час работы ў калгасах. Бывалі выпадкі, калі студэнты трэцяга і чацвёртага курсаў аддзялення рускай мовы і літаратуры спазняліся на работу, дрэнна працавалі. І зусім ўжо абураюча вялі сябе студэнткі Маркава і Іваніцкая (трэці курс рускага аддзялення). Яны абражалі калгаснікаў, распускалі пра іх плёткі. Усе выступаючыя гаварылі, што ў адносінах да такіх студэнтаў павінны быць прыняты самыя строгія меры.

У агульным жа студэнты факультэта добра працавалі на калгасных палях.

Палепшылася навукова-даследчая работа на факультэце. Прафесарска-выкладчыцкім складам было напісана і апублікавана многа каштоўных навуковых прац. Выйшлі ў свет тэматычныя зборнікі: «З гісторыі партыйна-савецкага друку ў Беларусі», «Працы па мовазнаўству» і іншыя. Добра вядуць навукова-даследчую работу т.т. Ларчанка, Булацкі, Захарава, Науменка, Міцкевіч і інш.

На сходзе падрабязна гаварылася аб рабоце спартыўных арганізацый, калектываў мастацкай самадзейнасці.

Партыйны сход абавязаў новы склад бюро ўзмацніць кантроль за якасцю акадэмічнай і навуковай работы. Паколькі зараз перад студэнтамі-філолагамі і студэнтамі-журналістамі стаяць новыя задачы па педагагічнай і вытворчай практыцы, трэба звярнуць асаблівую ўвагу на сувязь факультэта з жыццём, работай школ, рэдакцый газет.

Неабходна дабіцца таксама рэзкага паляпшэння дзейнасці навуковых студэнцкіх гурткоў, самастойнай работы студэнтаў, павысіць масавасць спартыўных арганізацый, палепшыць узровень мастацкай самадзейнасці. Адным са сродкаў барацьбы з дармаедамі, гультаямі і ўсімі тымі, хто ганьбіць званне савецкага студэнта, партыйны сход рэкамендаваў дэканату факультэта прадставіць рэктару універсітэта на часовае адлічэнне студэнтаў, якія праявілі пагардлівыя адносіны да фізічнай працы. Зноў залічаны ва універсітэт яны могуць быць толькі тады, калі пасля двух гадоў фізічнай працы прадставяць станоўчыя характарыстыкі з прадпрыемстваў, калгасаў і інш.

У склад новага партыйнага бюро факультэта абраны камуністы т.т. Ларчанка, Жыдовіч, Лысенка, Цімафеева, Кавалькоў, Пракоп'еў, Кукевіч.

**М. ШЫМАНСКІ.**



Тралейбус без кандуктара, кінотэатр без кантралёра, буфет без прадаўца. Гэтыя словы не выклікаюць у нас здзіўлення, а ўсё больш уваходзяць у наша жыццё. Увайшлі яны і ў жыццё студэнтаў гуманітарных факультэтаў. Гэта ў іх корпусе нядаўна адкрыўся буфет, які працуе без прадаўца.
НА ЗДЫМКУ: студэнты карыстаюцца паслугамі буфета.
Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

# Чаму „Рэха" не знаходзіць водгуку?

**Год назад студэнты аддзялення журналістыкі, якія займаюцца вывучэннем нямецкай мовы, пачалі выпускаць сваю насценную газету «Echo» («Рэха»). Кіруе выпускам газеты выкладчыца Берта Рыгораўна Шнеерсон.**

**Газета прывабіла будучых журналістаў. Рэдактарам «Рэха» з'яўляецца студэнтка II курса Таня Харавец. Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы нумараў прымалі цяперашнія другакурснікі Уладзімір Стэльмах, Мікола Астапенка, трэцякурснік Іван Вайцаховіч, студэнтка чацвёртага курса Ніна Загорская. Афармляў газету Уладзімір Халіп, а Уладзімір Стэльмах і Віталі Анцыфераў рабілі для газеты здымкі.**

**У канцы навучальнага года газета правяла конкурс на лепшы пераклад вершаў з нямецкай мовы. У ім прынялі ўдзел Васіль Кошаль, Аляксандра Новік з другога курса, Пётр Крываножанка з трэцяга курса і інш. Пераможцам аказаўся студэнт чацвёртага курса Уладзімір Паўлаў.**

**За мінулы навучальны год было выпушчана шэсць нумараў «Рэха». Цяпер рэдкалегія рыхтуе чарговы нумар газеты.**

**Супрацоўніцтва ў «Рэху» дапамагае студэнтам лепш вывучаць нямецкую мову. Толькі дзіўна, чаму іншыя факультэты не падхапілі ініцыятывы журналістаў. Студэнты вывучаюць нямецкую, англійскую, французскую мовы. Час паявіцца сваім «Рэхам» на гэтых мовах на матфаку, біяфаку, геафаку і г. д. Здаецца, што тут сваё першае слова павінны сказаць кафедры замежных моў, нашы выкладчыкі.**

**Я. ЛЯХАЎ.**

### ПАДПІСВАЙЦЕСЯ

**на часопіс міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі «Известия высших учебных заведений—горный журнал».**

Часопіс публікуе артыкулы, якія асвятляюць вынікі навукова-даследчых работ у вобласці горнай справы, што выконваюцца ў навучальных установах СССР, работы асобных савецкіх і замежных вучоных, якія асвятляюць сучаснае становішча асобных праблем горнай навукі і тэхнікі, найбольш значныя матэрыялы навуковых канферэнцый і нарад ВНУ, інфармацыі аб навуковай рабоце савецкіх і замежных вышэйшых навучальных устаноў, асвятляе вынікі ўкаранення ў вытворчасць важнейшых навуковых работ, перадавога айчыннага і замежнага вопыту.

Перыядычнасць часопіса — 12 нумараў у год. Кошт падпіскі на год — 120 рублёў, на 6 месяцаў — 60 рублёў.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19.
Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.
АТ 00477. Зак. 1807. Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Тыраж 2000.